# ЯГАДНЫМІ СЦЕЖКАМІ – ДА СПАГАДЫ І ДАБРЫНІ

28 лютага ў дзіцячым садзе № 39 г. Баранавічы адбылася сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўніком літаратурнага аб'яднання «Купальскія зоры» пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы г. Баранавічы – з паэтэсай Таццянай Мікалаеўнай Яцук. Паэтэса жыве ў Баранавічах, але нарадзілася ў Навагрудскім раёне Гродзенскай вобласці. Таму ўвайшла ў Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ. Таццяна Мікалаеўна ўладальніца прэстыжных узнагарод – лаўрэат абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі і прэміі імя А. І. Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Пісьменнік года – 2024».




Таццяна Мікалаеўна Яцук піша вершы для дарослых і дзяцей. Добрай традыцыяй сталі яе шматлікія сустрэчы з маленькімі чытачамі, якіх паэтка з задавальненнем знаёміць са сваімі кніжкамі: «Нечаканыя сустрэчы», «З паклонам да сонейка», «Прыгоды лесавічка Імшарыка і яго сяброў» і іншымі.

Выхаванцы старэйшых груп дзіцячага садка падчас лютаўскай сустрэчы сталі не толькі ўдзячнымі слухачамі, але і актыўнымі яе ўдзельнікамі. Дзеці даведаліся пра цікавыя факты з біяграфіі Таццяны Мікалаеўны, пазнаёміліся з дзіўным, чароўным светам яе твораў, з захапленнем адказвалі на пытанні, слухалі аўтарскую дэкламацыю вершаў,

гулялі ў перакладчыкаў, разгадвалі загадкі, разглядалі каляровыя ілюстрацыі да кніжак пісьменніцы, спявалі беларускія народныя песні.

Малышам вельмі спадабалася віктарына па казцы «Прыгоды лесавічка Імшарыка і яго сяброў». Выхавацелі старэйшых груп загадзя пазнаёмілі дзяцей з прыгодамі герояў твора – хлопчыка Юрыка і дзяўчынкі Палінкі – добразычлівых і спагадлівых дзяцей. Маленькія чытачы акунуліся ў таямнічы свет лясных жыхароў, разам з героямі прайшлі ягаднымі і грыбнымі сцяжынкамі. Гэтыя прыгоды дапамаглі пераканацца ў важнасці і значнасці духоўных каштоўнасцей: любові да роднай зямлі, шчырасці, спагады і дабрыні.

Таксама была арганізавана кніжная выстава па творчасці Т. М. Яцук. На літаратурнай сустрэчы нікому не было сумна. Пісьменніца падарыла свае кніжкі з аўтографамі на памяць дзіцячаму садку, а дзеці змаглі сфатаграфавацца на памяць з Таццянай Мікалаеўнай і ў знак падзякі ўручыць ёй букет вясенніх кветак.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член СПБ, паэтэса Таццяна Яцук у гасцях у маленькіх чытачоў сваіх кніг для дзяцей. Дзіцячы сад № 39 г. Баранавічы (Брэсцкая вобласць). 28 лютага 2025 года.




Мая Радзіма -
Беларусь!


8
Марта


8 Марта


8
Марта